НОВОСТИ ШУМИЛИНО SHUMILINO.BY
Официальный сайт газеты Шумилинского района “Герой працы”



Работники прокуратуры Шумилинского района ответили на вопросы корреспондента

Закон Общество

25.06.2018 shumilino 1980 Комментарии

Чатыры пытанні пракурорам



Сергей Зайцев

Асноўнымі задачамі пракуратуры з’яўляюцца забеспячэнне права, законнасці і правапарадку, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый, а таксама грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў. Пракуратура Шумілінскага раёна – гэта пракурор раёна Сяргей Зайцаў, намеснік пракурора Андрэй Дзергачоў і памочнік пракурора Наталля Гаўрылюк. Напярэдадні

прафесійнага свята – Дня работнікаў пракуратуры – мы задалі некалькі пытанняў пракурорскім работнікам.



Андрей Дергачёв

– Скажыце, чаму вы сталі менавіта пракурорскім работнікам?

С.З.: На мой выбар паўплывала маці, яна была настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Яна і бачыла мяне пракурорам, неаднойчы казала, што слова “пракуратура” ў перакладзе абазначае “клопат”. Менавіта таму пасля заканчэння школы і паступіў на юрыдычны факультэт БДУ.

А.Д.: Вызначыўся, што дакладна буду пракурорскім работнікам, на апошніх курсах вучобы ў ВДУ імя П. М. Машэрава. Што паўплывала на мой выбар? Відаць, на той момант зацікавіла работа пракурора ў якасці дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым пасяджэнні, тут трэба не толькі дасканала ведаць законы, а і ўмець сваю пазіцыю даказаць, абгрунтаваць.

Н.Г.: Са школы марыла стаць следчым. Зачытвалася дэтэктыўнымі раманамі, асабліва даспадобы была Агата Крысці з яе легендарным дэтэктывам Эркюлем Пуаро. Праўда, на апошнім курсе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь цвёрда вырашыла, што пайду ў пракуратуру.

– Якімі якасцямі павінен валодаць пракурорскі работнік?

На гэта пытанне ўсе трое адказалі практычна аднолькава: “Павінен быць высокакваліфікаваным граматным спецыялістам. Сумленным і справядлівым. І, самае галоўнае, прыстойным чалавекам”.

– Раскажыце, якім быў гэты год работы ў пракуратуры?

С. З.: Як звычайна, вельмі насычаным. Не хочацца напярэдадні прафесійнага свята “загружаць” чытачоў шматлікімі лічбамі. Так што спынюся толькі на адным аспекце. Лічу, што пракуратуры раёна ўдалося скаардынаваць работу ўсіх зацікаўленых



Наталья Гаврилюк

структур па прафілактыцы і зніжэнні ўзроўню злачыннасці ў раёне. Так, за апошнія чатыры месяцы зніжэнне злачыннасці склала 5%.

А. Д.: Пракуратурай раёна шмат увагі ўдзяляецца праблеме сямейнага насілля. Так, за апошні год мы ініцыявалі ўзбуджэнне дзвюх крымінальных спраў па такіх фактах.

Н. Г.: Зроблена вялізарная работа па Дэкрэце №18. Летась судовым рашэннем было пазбаўлена бацькоўскіх правоў 8 чалавек, а у 2016 – 11. Работа, на мой погляд, вядзецца ў правільным накірунку.

– Чым любіце займацца ў вольны час?

С. З.: Вольнага часу, на жаль, практычна няма. Вельмі люблю чытаць. Апошнія гадоў дзесяць “падсеў” на літаратурныя часопісы “Наш современник”, “Москва” і “Молодая гвардия”. Люблю пагартаць і класіку. З лірыкаў падабаецца Сяргей Ясенін, з празаікаў – Леў Талстой. Не супраць і фізічных нагрузак: басейн, настольны тэніс і веласіпед.

А. Д.: Мне даспадобы актыўны адпачынак. З сябрамі заўсёды рады пабегаць у міні-футбол. А яшчэ люблю парыбаліць. Для мяне важны сам працэс рыбалкі, а не ўлоў.

Н. Г.: Падабаецца чытаць кнігі. Толькі не дэтэктывы – іх хапае на рабоце. У кампаніі сяброў магу ўзяць у рукі гітару і паспяваць. Ды і тэлевізар не супраць паглядзець, асабліва калі там біятлонная трансляцыя.

Аляксандр ШЭДЗЬКО.

Надрукавана ў №49 ад 26.06.2018 г.

ВСТУПАЙТЕ В НАШУ ГРУППУ «ВКОНТАКТЕ»

ЭТО МОЖЕТ БЫТЬ ИНТЕРЕСНО:

Кочанова: для сохранения исторической правды необходима система последовательных решений

16.06.2022

На территории Шумилинского района приступили к наведению порядка

02.04.2020

МВД объявляет конкурс!

07.04.2021

Добавить комментарий

Ваш адрес email не будет опубликован. Обязательные поля помечены *

Комментарий *

Имя *

Email *

Сайт

Отправить комментарий

МЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

ЛЕНТА НОВОСТЕЙ



Кравченко: на учениях в Витебской области отработают комплекс задач территориальной обороны

27.09.2024 0



Земельные споры, правовые и жилищные вопросы. Левкович провел личный прием граждан в Витебске

27.09.2024 0



Лукашенко назвал санкции против Беларуси фашизмом

27.09.2024 0



Лукашенко: конкуренты делают все, чтобы сбить Беларусь с пути в новый экономический уклад

27.09.2024 0



Роуминг, признание виз, новые поезда и рейсы. Крутой рассказал о решении злободневных вопросов в СГ

27.09.2024 0



«Кто продолжит историю суверенной Беларуси?» Лукашенко раскрыл причину своих встреч со студентами

27.09.2024 0



Лукашенко о приоритетах будущей пятилетки: достойные условия труда, зарплата, соцподдержка

27.09.2024 0

Протасевич о встречах оппозиции за границей: не имеют никакой политической силы

27.09.2024 0

Православные верующие празднуют Воздвижение Креста Господня

27.09.2024 0

Кратковременные дожди ожидаются сегодня в Беларуси, возможны грозы

27.09.2024 0

Торговые сети продлили скидку в 10% на ряд товаров для уязвимых категорий населения

27.09.2024 0

Сегодня, 27 сентября, пройдёт электронная ярмарка вакансий для граждан предпенсионного и пенсионного возраста ищущих работу


27.09.2024 0

Программа праздничных мероприятий в рамках первого этапа областного фестиваля-ярмарки тружеников села «Дажынкі-2024» в г.п. Бешенковичи

26.09.2024 0

О ГАЗЕТЕ

СТАТИСТИКА САЙТА





ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Карпушенко Елена Николаевна
8(02130)5-34-13

АДРЕС РЕДАКЦИИ

211259, г.п. Шумилино, ул Ленинская, 24

РАЗМЕСТИТЬ РЕКЛАМУ В ГАЗЕТЕ И НА САЙТЕ

тел./факс 8(02130)5-34-09
G_pracy@vitebsk.by, reklama@shumilino.by

«ГЕРОЙ ПРАЦЫ» В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

© 2019 Шумилино | «Герой працы» | Все права защищены. Допускается цитирование материалов при условии размещения в тексте ссылки на сайт газеты «Герой працы» www.shumilino.by